Просто хорошая газета

# Отдушина

12+

№14 (813) 1 апреля 2020 года

Выхо... ...снована 18 октября 2002 года Издатель УП «Газета Слонимская» ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА



ФОТО АВТОРА

Руслан Яроцкий

ПУТЬ К БОГУ

# РУСЛАН ЯРОЦКИЙ: «Христианин не может не заниматься благотворительностью»

**В воскресной школе Свято-Троицкого собора в воскресенье, 29 марта, слонимчане встретились с белорусским миссионером, руководителем волонтерского движения «Дети Африки» Русланом Яроцким.**

Как отметил клирик собора священник Сергий Ярмолович, такую встречу ожидали полгода. Во время беседы Руслан рассказал о своей поездке в районы Африки для помощи нуждающимся, поделился воспоминаниями, а также показал фильм «Пастырь» о судьбах людей из знойной пустыни. Для некоторых слонимчан стало открытием, что даже в Африке есть православная церковь.

Девизом Христианского волонтерского движения «Дети Африки» служат слова «Чужая боль — наша забота». Находятся люди, которые готовы бескорыстно оказывать помощь даже детям, которые живут в далекой Африке.

Корреспондент «ГС» побеседовал с руководителем волонтерского движения «Дети Африки» Русланом Яроцким сразу же после встречи со слонимчанами.

**— Как появилась идея приехать в Слоним и рассказать о своей миссии?**

— Я представляю Христианское волонтерское движение «Дети Африки». На протяжении двух с половиной лет наше движение активно поддерживает связь со священниками из Жировичского монастыря. Они посоветовали связаться с отцом Сергием Ярмоловичем и отцом Дмитрием Семухой из Свято-Троицкого собора Слонима. Когда мы вышли на контакт с ними, они откликнулись и пригласили выступить перед слонимскими прихожанами. Миссионер Новогрудской епархии иерей Владимир Коляда организовали встречу, на которой ознакомили жителей города с нашей деятельностью.

**— Расскажите подробнее о вашей деятельности.**

— Уже на протяжении пяти лет мы ездим в Африку, где оказываем благотворительную помощь детским приютам. Мы ищем возможность рассказать о Кении для того, чтобы люди могли через нас или напрямую помогать приютам, с которыми мы работаем. Когда мы приехали в Слоним, то показали свой первый фильм об Африке. Верующие собрали пожертвования, а мы отвезли их в африканские приюты. Так завязалась дружба. Сейчас опять планируем совершить туда поездку. Поскольку люди помогают нам, то после возвращения мы «отчитываемся» о проделанной работе — где были, что сделали, что покупали, где потратили.

**— Что подвигло вас заниматься благотворительностью и почему была выбрана именно Африка?**

— Наверное, это личное призвание. А вообще, христианин не может не заниматься благотворительностью. Мной движет чувство сострадания. Побывав там, я понял, что тем людям гораздо хуже, чем нам здесь. Нам, по сравнению с ними, живется даже очень хорошо.

**— Как вас принимают в Африке?**

— Прекрасно, они очень рады нашим приездам. Мы привозим им еду, лекарства. Они очень благодарны нам за заботу. Когда мы посещаем приюты, обитатели рады даже простому карандашу. А если мы привезем шоколад или конфеты, то для них это вообще праздник. Мы рассказываем им о нашей стране. Это им очень интересно.

**— Почему вы выбрали Африку, ведь много других стран, которым нужна помощь не меньше?**

— Действительно, стран, которым нужна помощь, немало. И мы хотели бы помогать, но в списке самых бедных стран мира Африка занимает лидирующее место по нищете, по СПИДу и ВИЧ. Как пел Гребенщиков, «мне хорошо, где хреново, и плохо там, где хорошо», поэтому мы выбрали ту страну, где наша помощь остро необходима.

**— Вы довольны тем, как вас приняли в Слониме?**

— Слоним — это прекрасный город, здесь приятные люди, чудесные священники. Монастырь рядом, удивительная природа, а сегодня даже день солнечный. Чем больше езжу в Африку, тем сильнее люблю Беларусь. Надеюсь, с людьми и духовенством из вашего города дружба будет крепнуть.

**— Вы приезжаете в наш город и встречаетесь с людьми не в первый раз. Стало ли больше людей посещать ваши встречи?**

— Сейчас было чуть меньше людей, чем в предыдущие встречи. Но на это есть объективная причина — люди боятся коронавируса. А вообще приходит людей очень много, все очень открытые и общительные.

**— Что во время встречи могли увидеть зрители?**

— Что мы не так уж плохо живем. А еще то, что всегда нужно благодарить Бога за то, что имеем, за те банальные вещи, которые для многих людей не являются банальными — дышать, видеть, есть, душ принимать. Все то, что мы принимаем за должное, огромное количество людей не имеют и засыпают голодными. Я хочу верить, что, увидев мои материалы, слонимчане охотнее откликнутся на зов о помощи. Тем более что в век электронных технологий помогать стало проще.

**— Сейчас идет пост. Как вы его проходите?**

— Святитель Иоанн Златоуст говорил, что те деньги, которые ты сэкономишь во время поста, подобает отдавать бедным. Мы так и стараемся его проводить. Пост — это самое лучшее время для благотворительности. Период поста — эта не состояние медитации и экзальтации. Да, конечно, должны быть размышления о Боге, чтение Писания, посещение литургии и участие в таинстве причастия. Но и добрые дела никто не отменял.

**Максим СУДИЛОВСКИЙ**

# Пазнай сябе на фота

**Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-999, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Найбольш цікавыя расповеды пра герояў здымкаў будуць надрукаваны ў газеце, а іх аўтары атрымаюць запрашальныя квіткі на спектаклі Слонімскага драматычнага тэатра.**


Мастачка


Педагогі Слонімскай санаторна-лясной школы-інтэрната, 1968 год

На фотаздымак педагогаў Слонімскай санаторна-лясной школы, надрукаваны ў мінулым нумары «Аддушыны», першым адгукнуўся Алег Спасюк.

— Тут крайні злева Рыгор Рыгоравіч Будзіловіч, дырэктар школы. Я вучыўся ў яго, калі ён яшчэ быў дырэктарам Навасёлкаўскай СШ, — расказаў Алег Станіслававіч.

Другім у рэдакцыю патэлефанаваў Ігар Іўчанка, які пазнаў пасярод здымка настаўніка батанікі Канстанціна Канстанцінавіча Семяновіча і ўзгадаў прозвішча настаўніка геаграфіі справа Бубена Станіслава Сямёнавіча.

Яшчэ адна наша чытачка, Ніна Пацэвіч, пазнала на здымку ўсіх трох педагогаў — Будзіловіча, Семяновіча і Бубена.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

ФОТА З АРХІВА «ГС»

ВЫДАННІ

## «СЛОНІМСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР» — НОВАЯ КНІГА СЯРГЕЯ ЧЫГРЫНА

**Днямі ў Мінску выйшла з друку новая кніга літаратара і краязнаўцы са Слоніма Сяргея Чыгрына «Слонімскі драматычны тэатр».**

Як пазначана на задняй вокладцы, выданне прысвечана гісторыі дзяржаўнай установы культуры «Слонімскі драматычны тэатр» з нагоды яе 30-годдзя.

Свой 30-гадовы юбілей Слонімскі драмтэатр адзначыў 29 сакавіка праграмай «З юбілеем, наш любы тэатр!».

Да гэтай даты кніга Сяргея Чыгрына стала выдатным падарункам сённяшнім і былым артыстам і работнікам тэатра, а таксама шматлікім аматарам тэатральнага мастацтва ў Слоніме і не толькі. Тут варта адзначыць, што сам аўтар новай і другой ужо па ліку яго кнігі пра тэатр працуе загадчыкам літаратурнай часткі Слонімскага драмтэатра, а прафундаваў гэтае выданне былы артыст тэатра Мікалай Хальпін.

Кніга выйшла ў часопісным фармаце і складаецца з чатырох частак — «З гісторыі тэатральнага мастацтва Слонімшчыны», «Імгненні сцэнічнага жыцця», «Калектыў тэатра» і «Афішы». Назвы частак гавораць самі за сябе, а ўсе, хто меў і мае дачыненне да творчага жыцця Слонімскага драмтэатра, знойдуць сябе ў гэтай кнізе на фотаздымках.

Фотаздымкі, якія выкарыстаў са свайго архіва Сяргей Чыгрын, датаваны ад 40-х гадоў мінулага стагоддзя да нашага часу. Найбольш здымкаў, аднак, адлюстроўваюць гісторыю апошніх 30 гадоў дзяржаўнага існавання тэатра.

Як адзначыў у размове з карэспандэнтам «ГС» аўтар, набыць яго новую кнігу «Слонімскі драматычны тэатр» можна ў дзвюх нашых кнігарнях у Слоніме і ў «Акадэмкнізе» ў Мінску.

Работнікі Слонімскага драмтэатра атрымліваюць выданне ў падарунак.

**Мікола КАНАНОВІЧ**



Вокладка кнігі

# ФК «Слоним 2017» победил с крупным счётом волковысскую «Спарту»

**В субботу, 28 марта, на стадионе Слонимского УМГ ФК «Слоним 2017» в товарищеском матче победил с крупным счётом любительскую команду из Волковыска.**


ФОТО АВТОРА

Поединок

**«Слоним 2017» — «Спарта» (Волковыск) — 9:1 (4:0)**

**ФК «Слоним 2017»:** Напорко (Шишлов, 46), Кильманов (Баль, 52), Казаков (ИНП, 55), ИНП (Лозко, 23), Баль (Ровбут, 23 (Казаков, 73)), Орлов (Кильманов, 62), Курышев (Козлов, 62), Козлов (Гузов, 23), Кошель (к), Корзун (ИНП, 23), ИНП (Корзун, 62).

**Голы:** Орлов (3, 54), Корзун (5, 64), ИНП (8), Кошель (33, 71, 78), ИНП (50) — ФК «Слоним 2017»; Савоняка (60, пен.) — ФК «Спарта».

В матче с любителями из Волковыска слонимская команда порадовала своих болельщиков изобилием голов. Отличились все игроки из группы атаки. Трижды направил мяч точно в цель вышедший на поле с капитанской повязкой Сергей Кошель. А также после его передачи был открыт счёт в игре.

Гости поразили ворота слонимчан только один раз, и то со спорного пенальти.

**Сергей БУЗУН**

МИНИ-ФУТБОЛ

## СЛОНИМСКИЙ «ФОРСАЖ» — СЕРЕБРЯНЫЙ ПРИЗЁР ЧЕМПИОНАТА ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ ПО МИНИ-ФУТБОЛУ

**В гродненском спорткомплексе «Виктория» в субботу, 28 марта, МФК «Форсаж» в третьем решающем матче минимально уступил МФК «Электросети» из Лиды.**


ФОТО ИЗ АРХИВА «ГС»

У ворот

**«Электросети» (Лида) — «Форсаж» (Слоним) — 3:2 (3:1)**

**ФК «Форсаж»:** Сергей Берг, Владислав Берг, Олег Герасимчик, Денис Куцко, Вадим Спасюк, Андрей Молчанов, Виктор Берг, Вильгельм Берг, Владимир Корней, Юрий Левошик, Сергей Кутищев, Алексей Чернодаров.

**Голы:** Александр Круглый (15, 30), Валерий Таранда (28) — МФК «Электросети»; Олег Герасимчик (34), Вадим Спасюк (60) — МФК «Форсаж».

Слонимский «Форсаж» в упорной борьбе за чемпионство в первенстве Гродненской области хоть и уступил, но выглядел достойно. Решающая встреча проходила в жёстком соперничестве на грани фола.

К концу первого тайма лидчане вырвались вперёд — 3:0. Но Олег Герасимчик с 10-метрового штрафного удара сократил отрыв в счёте — 3:1.

За десять минут до финального свистка Вадим Спасюк сократил отставание до минимума — 3:2. Большего нашим футболистам, к сожалению, добиться не удалось. Они проиграли и стали серебряными призёрами чемпионата Гродненской области по мини-футболу.

Лучшим игроком матча в составе МФК «Форсаж» был признан вратарь Сергей Берг, который не единожды выручал свою команду.

**Сергей БУЗУН**

ВОЛЕЙБОЛ

## В СЛОНИМЕ ИЗ-ЗА КОРОНАВИРУСА ПРИОСТАНОВИЛИ ВСЕ СПОРТИВНЫЕ СОРЕВНОВАНИЯ

**В пятницу, 27 марта, в ДЮСШ Слонима из-за угрозы коронавируса в перерыве между матчами первенства города по волейболу среди мужских команд в рамках круглогодичной спартакиады объявили о приостановке всех спортивных соревнований в городе.**

В чемпионате города по волейболу в группе «А» без поражений выступают команды ГУП ЖКХ и в/ч 33933.

В группе «Б» лидирует команда «Супер стар», которая одержала победы над своими главными конкурентами: «Слоним газом» — 2:0 и «Мясокомбинатом» — 2:1.

**В пятницу, 27 марта, состоялись следующие игры:**

ЦРБ — DEXEN — 1:2

Трансгаз — СПК «Сынковичи» — 2:1

Слоним газ — в/ч 18315 — 2:0

Главный судья чемпионата Юрий Король сообщил, что по решению отдела спорта и туризма Слонимского райисполкома с 30 марта по 31 мая приостановлены все спортивные соревнования в городе.

**Сергей БУЗУН**


ФОТО АВТОРА

Последняя игра этой весной

ЮБІЛЕЙ

# Тэатр у Слоніме адзначыў 30-годдзе

У нядзелю, 29 сакавіка, драматычны тэатр у Слоніме адзначыў юбілей. Сёлета спаўняецца 30 гадоў, як загадам Міністэрства культуры на базе тэатра-студыі быў створаны дзяржаўны Слонімскі беларускі драматычны тэатр.


Гледачы ў зале


На сцэне


Дырэктар і артысты


У зале

Многія хваляваліся, каб імпрэза прайшла годна. І цуд адбыўся. Нягледзячы на тое, што ў свеце шалёна віруе каранавірус, тэатральнае свята засмуціць вірус не змог.

На святочнае мерапрыемства прыйшло каля сотні людзей. Вядучыя імпрэзы — дырэктар тэатра Аляксей Ткачоў і рэжысёр тэатра Васіль Сявец — у самым пачатку адзначылі, што дзень адметны дзвюма падзеямі — прафесійным святам усіх працаўнікоў Мельпамены і знамянальнай, памятнай датай гістарычнага летапісу культуры Слонімскага раёна.

Акцёры сваёй яркай ігрой прымусілі забыцца на турботы, адпачыць і атрымаць задавальненне ад убачанага. А паглядзець было на што, бо ў гэты дзень на сцэне паказвалі самае лепшае з рэпертуару тэатра.

Асабліва задавальненне гледачы атрымалі ад выступлення Сяргея Яўменава і Вікторыі Міхальчык. Дазволіўшы сабе выпіць на брудэршафт, набожны, але крыху зухаваты дыякан і немаладая жанчына губляюць кантроль над сваімі пачуццямі.

Пераўтварэнні, якія адбываліся падчас нумароў, не пакінулі абыякавым гледача. Дыякан у адзін момант становіцца рокерам Мікі Джагерам у скураных штанах і з гітарай на плячы. Кульмінацыяй яго выступлення стала разрыванне на сабе майкі на дзве часткі. З'яўленне ў такім вобразе перад жанчынай, з якой толькі што выпіваў, палохае апошнюю і робіць неверагоднае. Яна сама імгненна амаладжваецца і нават з'яўляецца ў туфлях на абцасах і блішчастай чырвонай кароткай сукенцы.

Не менш уражальнае пераўвасабленне паказалі Вікторыя Міхальчык і Ірына Яцук. Апошняя нават села на шпагат падчас свайго выступлення, чым паказала добрую фізічную падрыхтоўку.

Кожны артыст працаваў так, што не паверыць яму было нельга. Ігар Макараў і Дзіяна Федасевіч мелі не надта вялікія ролі, але найбольш выразныя.

Загадчык літаратурнай часткі драматычнага тэатра Сяргей Чыгрын адзначыў, што ён заўсёды хвалюецца выступаць на адной сцэне са слонімскімі артыстамі. «Яны як рыбы ў вадзе сябе адчуваюць, а мне заўсёды хвалююча пасля такіх прафесіяналаў выступаць», — паведаміў Сяргей Мікалаевіч.

Дырэктар тэатра Аляксей Ткачоў, звяртаючыся да гледачоў, падкрэсліў: «Толькі дзякуючы вам, вашым апладысментам, вашым усмешкам, вашым вачам мы працуем, паказваем тую творчасць, якую вы можаце бачыць. Мы вас вельмі шануем і вельмі любім». Звяртаючыся да ветэранаў тэатра, ён выказаў падзяку за іх парады, іх бачанне сённяшняга тэатра.

Таксама атрымалі віншаванні і артысты.

Падчас апытання, якое правёў тэатр у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» на лепшага артыста з пункту гледжання гледача, сталі вядомыя пераможцы. Дыплом за першае месца ў фотаконкурсе паводле апытання заняла Галіна Ерамейчык. Другое месца — ва Уладзіміра Навуміка. А за трэцяе месца дыплом атрымала Ірына Яцук.

Кранальная песня «Пакуль мы тут» завяршыла ўрачыстую імпрэзу, прысвечаную 30-годдзю драматычнага тэатра.

**Максім СУДЗІЛОЎСКІ**
ФОТА АЎТАРА

ФОТОКОНКУРС

# «УЧИСЬ У ВЕСНЫ. РАСЦВЕТАЙ»


Фото Валерии Станкевич

**Коллектив редакции «ГС» и салон-парикмахерская «Жемчужина» (спонсор) подвели итоги фотоконкурса «Весны ликующей блаженство». Единогласно победителем была определена Валерия Станкевич.**

На конкурс Валерия предоставила две работы — «Учись у весны. Расцветай» и «Весенний портрет».

За время проведения конкурса, который проводился с 6 по 30 марта, в редакцию было прислано 14 фотографий.

Ждем Валерию на награждении в пятницу, 3 апреля, в 16.00 в салоне-парикмахерской «Жемчужина» по адресу: ул. Красноармейская, д. 12.

Победительница получит приз — сертификат от студии красоты «Жемчужина» на 50 рублей.


**Юлия ТОЛКУН**

НАВІНЫ КНІГАРНІ

# НАДРУКАВАНА «РУСАЛКА» АЛЯКСЕЯ ЯКІМОВІЧА

**Днямі ў Мінску ў сталічным дзяржаўным выдавецтве «Беларусь» выйшла з друку новая кніга слонімскага пісьменніка Аляксея Якімовіча «Русалка».**

«Гэтая кніга надрукавана тыражом 800 экзэмпляраў па заказе Міністэрства культуры для падлеткаў і дарослых і ўваходзіць у спіс сацыяльна значнай літаратуры, — распавядае ў размове з карэспандэнтам «ГС» пісьменнік. — Яе змест складаюць чатыры фантастычна-містычныя апавяданні, напісаныя ўжо даўно, але неаднаразова мной перапрацаваныя. Некаторыя з іх друкаваліся ў свой час і ў «Газеце Слонімскай». Пісаліся гэтыя творы цяжка, бо тут закранаецца тэма, звязаная з нячыстай сілай. Напрыклад, сюжэт апавядання «Зялёная рука» ўзнік, калі я пачуў расповед дзяўчынак-падлеткаў на лаўцы ў двары свайго дома пра зялёную руку, якая робіць страшныя рэчы. Неўзабаве пасля гэтага я пайшоў у лес па грыбы. Трапіў там на прыгожую паляну. Раптам бачу, на краі паляны стаяць прыгожыя дзявочыя туфелькі чырвонага колеру... Мне стала не па сабе. Зайшоў за паваротку і ўбачыў на кусце дзявочую кофтачку. Праз некалькі дзён прыйшоў туды зноў — усё заставалася на месцы. Тады і вырашыў напісаць «Зялёную руку»...



Новая кніга Аляксея Якімовіча

Новая кніга Аляксея Якімовіча прадаецца ў кнігарнях і распаўсюджваецца выдавецтвам. Як зазначыў пісьменнік, у яго яшчэ ёсць новыя творчыя задумы і выдавецкія планы на бліжэйшы час.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

АКЦЫЯ

# Музей запрашае далучыцца да патрыятычнай акцыі

**Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя І.І. Стаброўскага запрашае далучыцца да патрыятычнай акцыі «У вайны не жаночае аблічча». Акцыя прымеркаваная да 75-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне над нямецка-фашысцкім акупантам.**


ФОТА АЎТАРА
Слонімскі краязнаўчы музей

Каб даведацца больш падрабязней пра акцыю, карэспандэнт завітаў у музей.

— Калі ідзе гаворка пра вайну, заўсёды ўзгадваецца мужчына. Мы вырашылі звярнуць увагу і на жанчын. Вытрываць тры складаныя гады пад акупацыяй, пракарміць дзяцей, неяк выжыць у гады ліхалецця — гэта таксама подзвіг, хай і не такі яркі, як на фронце, — расказвае навуковы супрацоўнік Сяргей Бурсевіч. — Летась мы збіралі матэрыялы пра мужчын — дакументы, фотаздымкі, пісьмы і г.д. У гэтым годзе фармат правядзення патрыятычнай акцыі не планавалі змяняць. Гэтай акцыяй мы заклікаем памятаць і расказваць пра сваіх родных, каб усе пра гэта ведалі. Забываць пра гэта нельга.

Цікава, што сёлета назва патрыятычнай акцыі «У вайны не жаночае аблічча» супадае з аднайменным творам нобелеўскай лаўрэаткі Святланы Алексіевіч. Як паведаміў Сяргей Якаўлевіч, тут нічога дзіўнага няма. Назву падбіралі так, каб яна была зразумелай і звяртала на сябе ўвагу. Таксама ён адзначыў, што ў мінулым годзе была праведзена акцыя па захаванні памяці аб нашых дзядах — салдатах, афіцэрах, генералах — тых, хто здабываў перамогу над ворагам.

— Прынеслі матэрыялаў у мінулым годзе даволі шмат. Восенню зрабілі выставу па тых матэрыялах. Тыя, хто даслаў дакументы, фотаздымкі, расказвалі пра сваіх родных. Атрымалася даволі цікава. Кожны паказаў сваю радню і даведаўся пра іншых. Нам вельмі спадабалася, і мы паспрабуем паўтарыць гэта, паколькі грамадствам гэта запатрабавана і людзям падабаецца, — падзяліўся Сяргей Бурсевіч.

Матэрыялы чакаюць па адрасе: г. Слонім, пл. Леніна, 1. Калі нехта не здолее прыехаць, то можна даслаць на скрыню: slonimmuzey@mail.ru.

**Максім СУДЗІЛОЎСКІ**

# ВОЙДИ В ИСТОРИЮ СВОЕГО ГОРОДА

В жизни каждого человека случаются как радостные, так и горестные события. Ведь именно из них и складывается хроника нашей жизни, которая может быть интересна не только нам, но и нашим потомкам. Поэтому давайте вместе создавать историю нашего Слонима.

Если вы хотите, чтобы издание «Отдушина» написало о вашей свадьбе, рождении ребенка, известило о смерти ближнего и напечатало некролог под рубрикой "Войди в историю своего города", пишите нам по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, Тел.: 612-26-43, 2-90-00 (Тел/факс) .

## Добро пожаловать, Танечка!

**Людмилу и Сергея Босак можно поздравить с прибавлением в семействе. 20 марта в 17 часов 45 минут у них родилась доченька, которую они нарекли Татьяной в честь родной тети. Вес малышки — 2 килограмма 400 граммов, рост — 49 сантиметров.**



В семье Людмилы и Сергея подрастает еще четверо детей: старшему сыну Дмитрию 11 лет, Юлии — 5 лет, двойняшкам Вике и Максиму скоро исполнится 3 годика.

Вот такое большое семейство!

В день выписки глава семейства Сергей пожелал дочери Танечке расти здоровой девочкой.

— От всей души желаю дочери здоровья, счастья, пусть все ее мечты и желания сбываются, — пожелал Сергей дочери.

## Добро пожаловать, Доминичка!

**В семье Анастасии и Андрея Пасюк великая радость: 20 марта в 16 часов 25 минут у них родилась девочка. Нарекли родители свою дочурку Доминикой. Имя имеет латинские корни и означает «принадлежащая Господу».**



Вес малышки — 3 килограмма 30 граммов, рост — 51 сантиметр.

Доминичка — третья доченька в семье Анастасии и Андрея. Старшей дочери Диане 12 лет, средненькой Алине — 7 лет.

В день выписки в выписной комнате Анастасию встречал супруг, доченька и ее мама. Все они адресовали мамочке и новорожденной самые добрые пожелания.

— Желаю дочери здоровья, это самое главное и самое ценное для каждого человека, пусть ее окружают счастье, любовь и удача, — пожелал Андрей дочери.

## ГОРОСКОП ДЛЯ САМЫХ МАЛЕНЬКИХ

### Маленькие Рыбки
**21 февраля-20 марта**



Рыбы — это водный знак, поэтому дети, рожденные под ним, обладают сильной эмоциональной натурой. Со временем вы научитесь различать тонкие чувства вашей маленькой Рыбки, которые в младенчестве еще сложно разобрать. В детстве Рыбы могут помнить какие-то факты из своих прошлых жизней. Родителям рекомендуется окружить малыша комфортом, создать вокруг гармоничную обстановку, кормить и укладывать спать строго по расписанию.

Взрослея, малыши могут часто проявлять свои эмоции с помощью слез, поскольку от природы очень ранимы. Научите их выражать свои чувства словами, это поможет обрести уверенность в себе. Возможно, вы не обладаете таким же безграничным внутренним миром, как ваш малыш, зато можете научить его всему богатству родного языка для выражения своих мыслей.

Есть в характере Рыб нечто мистическое, что проявляется в мудрости и в большой способности к состраданию. Обычно малыш, рожденный под этим знаком Зодиака, с детства знает о своей тонкой натуре. Родители же могут развивать его способности, занимаясь с малышом музыкой или разучивая поэзию. Конечно, выбор предмета для изучения должен сделать сам ребенок.

Ваш малыш способен удивить вас своим природным чувством красоты и грацией. Вы даже можете стать более чувствительным человеком, если глубже постигнете внутренний мир своего ребенка. Иногда для общения с маленькими Рыбами недостаточно просто слов. Будьте готовы к тому, что, возможно, придется выражать свои эмоции с помощью визуальных форм.

**www.astrostar.ru**



Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК
anna@gs.by

З ГІСТОРЫІ КРАЮ

# Страчаная спадчына вёскі Мізгіры

**Матэрыяльная культура Беларусі налічвае шмат гісторыка-культурных каштоўнасцей, але яшчэ больш такіх помнікаў гісторыі было страчана ў часе. Вось і вёска Мізгіры на Слонімшчыне захоўвае такую таямніцу аб страчанай спадчыне...**




Царква ў Мізгірах на польскай мапе

Царква Пятра і Паўла ў Мізгірах у наш час

Трошкі наводдаль ад вёскі стаіць мураваная царква святых апосталаў Пятра і Паўла, якая была пабудавана яшчэ ў 1868 годзе на сродкі прыхаджан. Калі паглядзець на тапаграфічныя карты польскага часу, то можна ўбачыць на тым месцы дзве царквы, другая знаходзілася побач з цяпер існуючай, на мясцовых могілках.

Пра другую драўляную Крыжаўзвіжанскую царкву ёсць пісьмовы ўспамін, які датуецца 1899 годам. У апісанні значыцца, што царква была ў каменнай агароджы і збудаваная ў 1815 годзе абшарнікам Фамой Шушкевічам. У ёй маецца вялікая разьбяная выява ўкрыжаванага Хрыста, выява гэта лічыцца цудатворнай і вельмі шануецца народам. Да гэтага цудатворнага крыжа сыходзіліся вернікі, а найбольшая колькасць людзей збіралася да крыжа 14 верасня, на свята Узвіжання. Пра крыж таксама пішуць, што ён быў пафарбаваны з азалачэннем і пасрэбраннем у ззянні німбу, і да яго мелася шмат металічных прывесак рук, ног, сэрцаў, вачэй... Магчыма, гэта была падзяка, дар за збавенне такой жа часткі цела ад хваробы.

Таксама ў пісьмовай крыніцы гаворыцца пра тое, што ў драўлянай царкве быў летапіс і менавіта ў гэтым летапісе перадавалася, што самая першая тут царква была збудавана да 1700 года, калі здарыўся на могілках цуд: ад могілкавага крыжа стаў бачыць сляпы чалавек. Пра гэта гаворыцца, што сляпы спаў вясною на могілках каля крыжа і яму з`явіўся Збаўца са словамі: «Што ты тут спіш, устань і паглядзі, дзе ты і што ёсць каля цябе».

Сляпы ўстаў і сапраўды аказаўся адразу відушчым і мог аглядаць наваколле.

На месцы збаўлення неўзабаве зладзілі царкву, у якой і змясцілі гэты крыж. Да крыжа на збаўленне пачало сыходзіцца вельмі шмат людзей.

У 1733 годзе замянілі першую невялікую царкву большай, каб можна было змясціць большую колькасць вернікаў. Але гэтая вялікая царква ў 1745 годзе згарэла ад навальніцы, святое ж распяцце, якое там знаходзілася, засталося ў цэласці асаблівым Божым цудам. Справа ў тым, што падчас пажару храм не гарэў, а тлеў ціхім роўным агнём, не прычыняючы шкоды ні прадметам, што былі ў ім, ні людзям, якія ратавалі іх. Калі ж амаль усё па магчымасці было вынесена, ён рассыпаўся як перагарэлы вугаль. Але і зноў на гэтым месцы была збудавана новая царква, а ў дадатак яшчэ пры ёй багадзельня са школай.

Калі ў 1815 годзе вылечылася ў гэтай царкве перад святым распяццем «скручаная ў клуб» жонка нейкага Фамы Шушкевіча, то гэты Фама Шушкевіч, у знак падзякі, узвёў вялікі драўляны храм, меў ён да гэтага вялікую стараннасць і таму набываў самы лепшы матэрыял. Магчыма, менавіта таму царква стаяла трывала вельмі працяглы час. Увесь гэты час распяцце знаходзілася ў царкве і прыцягвала да сябе значную колькасць вернікаў.

Крыжаўзвіжанская царква праіснавала да 1963 года, затым была разабрана, а далейшы лёс цудатворнага крыжа невядомы.

> У вёсцы яшчэ засталіся сведкі, якія памятаюць пра знішчаны храм, а на свята Узвіжання Святога і Жыватворчага Крыжа Гасподняга іерэй з вернікамі здзяйсняюць хрэсны ход і малебен на месцы, дзе была царква.

**Іна НЯЧАЙ**

# Афиша




**Слонимский драмтеатр**

**5 апреля, воскресенье**
Спектакль для взрослых «Незваный гость». Начало в 17.00. Цена 6 руб.

**Слонимский центр культуры**

**Кинозал**

**1 апреля, среда**
12.00, 14.00 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
16.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)
18.00, 20.00 «Отдай свою душу» 2D (ЮАР, 18+, ужасы, 1.45)

**2 апреля, четверг**
12.00, 14.00 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
16.00 «Отдай свою душу» 2D (ЮАР, 18+, ужасы, 1.45)
18.00, 20.00 «Морские паразиты» 2D (Ирландия, 18+, фантастика, 1.30)


**3 апреля, пятница**
12.00, 14.00 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
16.00 «Отдай свою душу» 2D (ЮАР, 18+, ужасы, 1.45)
18.00, 20.00 «Морские паразиты» 2D (Ирландия, 18+, фантастика, 1.30)

**4 апреля, суббота**
12.00, 14.00 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
16.00 «Отдай свою душу» 2D (ЮАР, 18+, ужасы, 1.45)
18.00, 20.00 «Морские паразиты» 2D (Ирландия, 18+, фантастика, 1.30)

**5 апреля, воскресенье**
12.00, 14.00 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
16.00 «Отдай свою душу» 2D (ЮАР, 18+, ужасы, 1.45)
18.00, 20.00 «Морские паразиты» 2D (Ирландия, 18+, фантастика, 1.30)




# Зялёны рукзак



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

У сярэдзіне лета стаяла такая гарачыня, што ў Хлестаковічах гурочнік ды бульбоўнік нават за ноч не паспявалі падняць лісты, як ты ні палівай. Гаспадыні бедавалі: змарнуецца іхняя праца, і наградах нічагусенькі не вырасце.

— Не магу пазіраць на ўсё гэта, — сказала свайму Вінцуку Алеся Ражкевіч. — Кожнае лета мой агарод быў лепшы, чым у іншых, а сёлета зраўняўся, нібыта і не даглядаю яго... Душа баліць, дый годзе!

— Ну і чым лячыць тваю душу? — пасміхаўся ў вусы худы сутулы Вінцук, які вясной пайшоў на пенсію і цяпер поркаўся на сядзібе, усё шукаў якой работы. — Мо ў Мінск паедзь да сястры, развейся, купі сабе што, вось настрой і пераменіцца. А па агародніне не бядуй. Як кажуць, што ўсяму міру, тое і бабінаму сыну. Да восені яшчэ далёка, як пойдуць дажджы, то ўсё выправіцца і вырасце проста на вачах.

— А як не пойдуць?

— То і пры табе не пойдуць, хоць дома сядзі, хоць за домам. Я паліваць буду, як і паліваў. А больш што мы можам зрабіць?

Вінцук добра ведаў характар сваёй Алесі. Яна любіла працаваць, і што там казаць, любіла прыбірацца. Іншая апранатка ў старасці і сядзела на ёй нібы на карове сядло, бо была тоўстая як бочка, на кароценькіх крываватых нагах. Як тут ні прыбірайся, а ўсё роўна да Сафіі Ратару недацягнеш. Але калі баба, апрануўшы чарговую абноўку, пытала:

— Ну, ці хораша ж мне?

Адказваў:

— Сядзіць як на каралеўне!. Малайчына, маеш добры густ...

Ён наогул заўсёды згаджаўся з жонкай, таму і жылі ў ладзе ды згодзе.

Нават на пенсіі Алеся купляла абноўкі. То ў райцэнтраўскім універмагу, а найбольш ездзіла ў Мінск, дзе жыла яе малодшая сястра — такая ж тоўсценькая каробачка на кароткіх ножках. Зіна працавала швачкай у атэлье, і яе аўтарытэт у плане ўбораў для Алесі быў вельмі вялікі.

З пустымі рукамі да сястры не паедзеш, і Вінцук з вечара дапамог уладкаваць у сумку гасцінцы: свежы сыр, масла, тварог. Набралі вядро трускавак.

— Узяла б яек, — параіў Вінцук.

— Зараз! Каб яны патаўкліся ды спэцкалі ўсё ў сумцы. Калупайся потым, выціраючы.

— Ты ж грошай не шкадуй, добрае штосабе купі, — параіў на развітанне. — Былі ў цябе ўборы, ды сама ведаеш, дзе дзеліся.

Алеся ведала. Мінулай вясной, калі Вінцук паехаў у райцэнтр, а яна капала агарод, злодзей залез у шафу і павыносіў самае добрае адзенне. І гаспадыніны сукенкі, кофты, і гаспадароў касцюм, які ён толькі раз апрануў да суседзяў на юбілей вяселля. Для Алесі гэта была сапраўдная трагедыя. Як яна тады плакала! Вінцук не ведаў, якія словы знайсці для суцяшэння. У міліцыю, канечне, заявілі, але ж ніхто не бачыў таго злыдня, каб засведчыць, бо людзі ўпраўляліся з гародамі. Не да назіранняў было.

Зіна ў той дзень мела выхадны і сустрэла сястру на аўтавакзале. Яны тралейбусам праехалі некалькі прыпынкаў і былі каля высокага панэльнага дома на шмат пад`ездаў. Падняліся на другі паверх, не чакаючы ліфта.

Рантам Алеся стала ля дзвярэй як укопаная:

— Пачакай, пачакай... — прамовіла, зніякавеўшы. — Давай зноў выйдзем на двор, мяне там нешта зацікавіла...

— Што? Такой гарачынёй ды будзем бэрсацца туды-сюды...

Алеся, не слухаючы сястру, паставіла на пляцоўцы сумку і ледзь не подбегам кінулася ўніз. Крыху адышлася ад пад`езда і, узняўшы галаву, пачала ўглядацца ўверх.

— Што ты там убачыла? — Зіна таксама падышла бліжэй і пачала ўглядацца на паверхі.

— Ціха... — прыклала палец да губ Алеся. — Бачыш зялёны рукзак на вяроўцы на трэцім паверсе?

— Ну бачу...

— А кофту сінюю ды ружовую, сукенку блакітную, мужчынскі касцюм карычневы ў палоску?

— Ну дык і што?

— А тое, што ўсё гэта нашы рэчы, якія ў мінулым годзе спёр невядомы злодзей. Дабруткія рэчы, амаль навюткія. І рукзак наш сушыцца, у якім прыпёр адзенне. Мне цікава, хто там жыве?

— П`яніца Віцька Рабовіч. Ужо шмат гадоў нідзе не працуе, не раз сядзеў у турме за крадзяжы... Дык, кажаш, гэта ваша?

— А няўжо ж чыё?! Ну і гад! Дзіва, што наша міліцыя не магла знайсці злодзея. Чорт яго знойдзе, раз ён ажно са сталіцы прыпёрся красці!

— Ты думаеш, у вас адных украў? Ён гастралірue, лічы, па ўсіх абласцях. Патрымае ў сябе рэчы, пачакае, ці зловяць, ці так сыдзе, а потым памые і заганяе за гарэлку ці віно. Мые, бо ў ягонай кватэры такі бруд і сырасць, смярдзіць усё.

— Я яму заганю, дух з яго будзе гнаць! — закрычала Алеся. — Пайшлі ў міліцыю, пакуль дзе не збаёдаў майго дабра.

Яны хуценька зайшлі ў кватэру, паставілі пачастункі, што прывезла Алеся, і пайшлі ў міліцыю. Яна была на суседняй вуліцы.

І паўгадзіны не мінула, як дужыя хлопцы ў форме вывелі з пад`езда худога, коратка абстрыжанага чалавека з татуіроўкай на абедзвюх руках. Вопратку, зняўшы з балкона, таксама ўзялі.

— Дык гэта ж усё маё! — не зразумела Алеся.

— Потым аддамо, а цяпер гэта рэчавыя доказы.

— То і зялёны рукзак вазьміце. Ён таксама наш, у яго злодзей складваў крадзенае, — параіла Алеся, шчыра радуючыся, што так нечакана знайшлося яе дабро...

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ**

Главный редактор Николай Николаевич Кононович

Учредитель Анна Павловна ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

**Телефоны редакции:**
Velcom: 8-029-133-04-21
**факс:** 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до **18.00**
**Skype — gazslon**

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.



**Свободная цена**

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 31 марта 2020 года 17:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8(044) 715-90-03
8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03
ул. Красноармейская, 41
**e-mail:** gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
ЛП №02330/39 от 27.03.2014
Заказ № 1701

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362

